што калектыў дружны, адкрыты. І параіцца ёсць з кім, ёсць настаўнік, за якім яна замацавана, урач-неўролаг Кацярына Кілеса. Калі нешта незразумела — і падкажа, і дапаможа. Ды і магілёўскія калегі, з якімі пазнаёмілася ў інтэрнатуры, заўсёды гатовы падставіць плячо. Прафесійная этыка, як той казаў, працуе.

За кароткі час сваёй работы ў Быхаўскай ЦРБ суразмоўніца паспела пабываць на раённым маладзёжным турзлёце, у якім брала ўдзел бальніца. Там атрымалася прадэманстраваць свае творчыя таленты — Аліна добра іграе на гітары.

— У школе паралельна чатыры гады вучылася ў «музыкалцы» іграм на піяніна, — усміхаецца дзяўчына. — Вельмі падабаўся мне гэты інструмент. Але не хапала часу займацца. Затое гітару ўжо сама асвоіла. Добры спосаб пераключыцца і ўзняць настрой сабе і іншым.

Фінансавым складнікам у сваёй рабоце маладая спецыяліст таксама не пакрыўджана. Хаця першай зарплаты яшчэ не было, яле яна ўжо ведае, колькі прыблізна атрымае на рукі. Кажа, што для пачаткоўца гэта даволі годная сума. А хутка яшчэ і пад'ёмныя выплацяць.

Вось толькі пасля вялікага горада цяжка прыстасавацца да запаволенага рытму жыцця раённага цэнтра. Сеткавікі ў горадзе ўжо ёсць, а вось з сучаснымі месцамі адпачынку — напружанне. Схадзіць вечарам з сябрамі асабліва няма куды.

— Пакуль для мяне Быхаў — гэта перш-наперш работа, — кажа Аліна. — Мне падабаецца маё рабочае месца, людзі, з якімі займаюся любімай справай. Гэта добры вопыт і цудоўны старт. Але хочацца развівацца. Мне падабаецца экстранная дапамога, складаныя пацыенты. Хачу цалкам рэалізавацца ў гэтай дзейнасці і прыносіць карысць грамадству.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Аліны АНДРУШЫНАЙ.**

# Да новых вяршынь — з новым настаўнікам

**Сёлета ва ўстановы сярэдняй адукацыі і дзіцячыя сады Полаччыны прыйшлі каля 60 маладых спецыялістаў. У кожнага — свае вялікія планы на першыя крокі ў педагагічнай прафесіі. Настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 18 імя Ефрасінні Полацкай горада Полацка Марыя НАСАТОВІЧ, нягледзячы на юны ўзрост, ужо абрала для сябе педагагічны стыль — патрабавальны і строгі.**



18-гадовая Марыя Сяргееўна родам з Полаччыны. Прымаўка «дзе нарадзіўся — там і згадзіўся» спрацавала не толькі для яе, але і для старэйшай сястры. У сям'і Насатовічаў увогуле склалася невялікая дынастыя педагогаў: адна бабуля ў свой час выкладала фізічную культуру і здароўе, другая вучыла дзяцей рускай мове і літаратуры. Марыя і яе старэйшая сястра Яна прадстаўляюць пакуль другое пакаленне настаўнікаў — Яна ў гэтай галіне працуе ўжо чацвёрты год, а наша гераіня толькі прыйшла на першае рабочае месца.

Дзяўчына скончыла педагагічны каледж ВДУ імя П. А. Машэрава. Выбіраючы будучую прафесію, была ўпэўнена, што стане настаўнікам. Па-іншаму, напэўна, у такой сям'і і быць не магло. «Вельмі люблю дзяцей, у мяне шмат сясцёр і братоў, я ўвесь час праводзіла з імі. Спадзяюся, што ў школе ўсё будзе добра і я не расчарую дзяцей. Каледж даў мне добрую падрыхтоўку: было шмат практыкі, гутарылі з настаўнікамі, якія яе праводзілі. Яны ж і ацэньвалі нас. Я ўпэўнена, што ўсё атрымаецца. Наогул, прыступаю з вельмі пазітыўным настроем, але хвалююча вельмі. Чакаю з нецярпеннем Дня ведаў, каб убачыць дзяцей», — расказала Марыя Насатовіч. Дыплом дзяўчыны дазваляе выкладаць рускую мову і літаратуру ў старшых класах, аднак душа нашай гераіні больш ляжыць да маленькіх, таму і пайшла ў пачатковыя класы.

За амаль тры гады ў каледжы Марыя атрымала педагагічныя веды не толькі ў тэорыі. Выбіраючы месца пераддыпломнай практыкі, звярнула ўвагу на СШ № 18 — буйную, прыгожую, з дасканалай сучаснай інфраструктурай і вялікай калекцыяй навучэнцаў. Сюды ж малады педагог прыйшла на размеркаванне і плануе застацца ва ўстанове адукацыі пасля абавязковых двух гадоў. Дарэчы, на першым званку Марыя будзе сустракаць 28 дзетак, якія пойдуць у чацвёрты клас. «Не страшна. Галоўнае — зразумець, хто ёсць хто, і наладзіць у калектыве атмасферу адзінства. Важна заўважыць задаткі талентаў вучняў і дапамагчы іх развіць. Але, нягледзячы на мой юны ўзрост, быць дзецям сяброўкай і дазваляць пераходзіць граніцы я не буду. Школьнікі павінны разумець, што да настаўніка трэба ставіцца з павагай», — разважае дзяўчына.

У мінулым годзе ў 18-ю школу прыйшлі сем маладых спецыялістаў, сёлета — тры. Установа адукацыі цалкам укамплектавана настаўніцкімі кадрамі. За кожным маладым спецыялістам тут на працягу двух і больш гадоў усталёўваецца настаўніцтва — за імі замацоўваюць спецыялістаў з першай і вышэйшай катэгорыямі. Па словах **дырэктара школы Канстанціна ШУХЛЕВА**, кожнаму маладому спецыялісту ўстанаўліваецца надбаўка за кантрактную форму найму. «Мы падтрымліваем нашых маладых спецыялістаў яшчэ і тым, што пры наяўнасці такой магчымасці яны пішуць заяву на выдзяленне арэнднага жылля. Два спецыялісты нашай школы яго ўжо атрымалі», — распавёў дырэктар.

«Сёлета сямі маладым спецыялістам першага года працы па выніках першай чвэрці (гэта магістранты і тыя, хто з чырвоным дыпломам скончыў навучальныя ўстановы) мы прысвоілі другую кваліфікацыйную катэгорыю, што дало ім магчымасць мець большы заробак, адпаведна, надбавачную прэміяльную частку», — дадаў Канстанцін Шухлеў. Ён падкрэсліў, што асобна для маладых спецыялістаў на кожных канікулах у школе праводзяць заняткі, каб тым лягчэй было ўнікаць у працэс, працаваць з дакументамі і рыхтавацца да ўрокаў.

Афіцыйна Марыя Насатовіч прыступіла да працы зусім нядаўна, 15 жніўня. Даволі вялікі калектыў — 146 педагогаў — сустрэў добразычліва. У хуткім часе да дзяўчыны прымацуюць вопытнага педагога-куратара, які будзе дапамагаць ва ўсіх незразумелых момантах. Падрыхтоўцы будучых кадраў у школе ўдзяляюць вялікую ўвагу, цесна супрацоўнічаюць з ВНУ. «Гэта і наш Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай. Ганарымся тым, што кожны год (і гэты не выключэнне) 50 % нашых выпускнікоў паступаюць у ПДУ на разнастайныя спецыяльнасці. Таксама супрацоўнічаем з галаўным абласным ВНУ — Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П. М. Машэрава, дзе таксама заказваем кадры. Калі ўстанова адукацыі бачыць навучэнца, які гарыць жаданнем, дапамагаем яму знайсці сваё прызванне. У тым ліку і шляхам мэтавых накіраванняў», — адзначылі ў адміністрацыі школы.

На педагогіку ў гераіні даволі вялікія планы, Марыя ўжо паступіла ў ВДУ на завочнае аддзяленне. Цяпер прыйдзецца сумяшчаць несумяшчальнае, бо ні для каго не сакрэт, што працоўны дзень настаўніка не заканчваецца разам з урокамі. Але, расказвае Марыя Насатовіч, маладосць і азарт дазваляюць паспяваць усюды. Радуе дзяўчыну і тое, што тут, у васямнаццатай школе, ёй сваё плячо падставіць родная сястра Яна, якая мае ўжо грунтоўны вопыт. А пакуль Марыя маральна і фізічна рыхтуецца да новага навучальнага года, набывае неабходную літаратуру і метадычныя дапаможнікі і, вядома, з нецярпеннем чакае першы званок.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з архіва гераіні.**



Фота БелТА.

работы для ўсіх профільных спецыяльнасцяў краіны, восем з іх — у сельскагаспадарчай галіне.

## АРЫЕНЦІР НА ПРАКТЫКУ

Назва Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта гаворыць сама за сябе, там рыхтуюць тэхнароў для сельскай гаспадаркі па ўсіх кірунках: інжынераў, інжынераў-механікаў, спецыялістаў тэхнічнага профілю па тэхнічным сэрвісе, энергетыцы, цеплатэхніцы, аўтаматызацыі, ахове працы — гэта значыць, увесь цыкл інжынернай службы, які неабходны для сельскай гаспадаркі.

На думку **рэктара БДАТУ Мікалая РАМАНЮКА**, нішто так не дапамагае падрыхтаваць сапраўды дасведчанага спецыяліста, як магутная і сучасная матэрыяльна-тэхнічная база, якую ўніверсітэт і мае. Месцазнаходжанне ВНУ — у сталіцы краіны, дзе дыслакуецца галоўны навуковы цэнтр — Нацыянальная акадэмія навук. Гэта дазваляе надаваць адукацыі інавацыйны характар, прыцягваць да навучальнага працэсу тытулаваных вучоных, а таксама праводзіць заняткі ў навукова-практычных цэнтрах і навукова-даследчых інстытутах.

І яшчэ адна перавага, якая іграе на будучыню выпускнікоў — практыкаарыентаванасць.

— Ва ўніверсітэце толькі 25 працэнтаў лекцыйных заняткаў. А больш за 50 % выкладчыкаў у нас маюць вытворчы стаж, — распавядае рэктар. — Мы практыкуем трохэтапную падрыхтоўку студэнтаў. На першым курсе даём ім рабочую прафесію слесара па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, на другім і трэцім яны атрымліваюць прафесію трактарыста-машыніста трох катэгорый, у тым ліку самаходных машын і збожжаўборачных камбайнаў. Ну, і, нарэшце, атрымліваюць пасведчанне кіроўц транспартных сродкаў катэгорыі «В».

Сёння кіраўнік дзяржавы паставіў задачу больш актыўна выкарыстоўваць дроны ў сельскай гаспадарцы.

— Мы працуем над гэтым не першы год. Цяпер на базе нашага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў прайшла навучанне група спецыялістаў — аператараў па кіраванні БПЛА. Думаю, што ў перспектыве БДАТУ будзе даваць студэнтам універсітэта альбо працоўную прафесію, альбо пасведчанне аператара па кіраванні беспілотнікамі.

## СУВЯЗЬ НЕ ГУБЛЯЕМ

Падрыхтоўка спецыялістаў практычна па ўсіх спецыяльнасцях, якія запатрабаваны ў сельскай гаспадарцы, акрамя ветэрынарнай медыцыны, — такі профіль найстарэйшай аграрнай установы адукацыі — Беларускай дзяржаўнай ордэнаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі.

Па словах **рэктара акадэміі Віталя ВЕЛІКАНАВА**, з першага курса арыентаваныя на практыку, інавацыйную і навуковую дзейнасць студэнты гэтай ВНУ аўтаматам атрымліваюць і запатрабаванасць, і паспяховую прафесійную кар'еру пасля заканчэння акадэміі. Гэтаму ж садзейнічае і цесная работа з базавымі прадпрыемствамі, на якіх арганізавана 60 філіялаў установы адукацыі і дзе на рэгулярнай аснове праходзяць навучанне студэнты БДСГА.

Тут 62 працэнты выкладчыкаў маюць вучоныя ступені. У акадэміі працуе тэхнапарк «Горкі», інавацыйная структура, якая ўкараняе ў навучальны працэс элементы дакладнага земляробства і не толькі. Студэнты маюць магчымасць займацца навуковай працай. І паспяхова гэта робяць: імі выдадзена больш за 1800 навуковых артыкулаў.

— Мы ганарымся сваімі студэнтамі. Але самае галоўнае — калі выпускаем за сцены акадэміі, іх не кідаем, — распавядае Віталь Веліканаў. — У нас распрацавана сістэма суправаджэння маладога спецыяліста на вытворчасці. Мы яго курыруем не толькі два гады (калі студэнт вучыўся на агульных падставах), але і наступныя два-тры гады. Калі падрыхтоўка была мэтавая, то пяць і больш гадоў. Для гэтага замацоўваем настаўнікаў з ліку былых куратараў выпускнікоў ці кіраўнікоў дыпломных работ. Яны маюць пастаянную сувязь з маладымі спецыялістамі, сочаць за іх работай, прасоўваннем. На кафедрах факультэтаў вядуцца кнігі ўліку, дзе фіксуюцца звароты нашай моладзі па самых розных пытаннях, у тым ліку і сацыяльна-бытавых. Выкладчыкі звяртаюцца ў органы мясцовай улады, і ўсе пытанні вырашаюцца.

І ўсё ж, на думку рэктара сельскагаспадарчай акадэміі, важная, калі не ключавая, роля ў замацаванні кадраў адведзена наймальнікам. Менавіта яны ў першую чаргу павінны быць зацікаўлены ў тым, каб утрымаць спецыялістаў, стварыць спрыяльныя ўмовы для іх працы і адпачынку, забяспечыць дастойнай заработнай платай і добраўпарадкаваным жыллём.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**